**Валерыя Шпак**

## Дзве купінкі, або Старонка з майго дзённіка

*25 лютага, чацвер*

Я не хаджу ў школу ўжо другі тыдзень. Хварэю. Сёння мне вельмі сумна і неяк няўтульна. На душы цяжка. І не толькі таму, што хварэю і даўно не бачылася з маёй мілай сяброўкай Маргарытай. І не таму, што за акном шэра як ніколі, імжыць увесь дзень. Бабуля такое надвор’е чамусьці называе кіслым. Кісла за акном і кісла на душы. А ўсё таму, што я раззлавалася на Лаўрука. Можа, гэта і дзіўна, камусьці незразумела. Але так. Я раззлавалася на Лаўрука, героя апавядання Змітрука Бядулі “На Каляды к сыну”. Вырашыла пачытаць, каб не адставаць ад класа, і сама сабе сапсавала настрой. Як ён мог так паступіць са сваёй мамай?! Яна так любіла яго, “слепа радавалася, фанабэрылася перад суседзямі. Гэта быў увесь яе скарб”. Як мне шкада гэту няшчасную жанчыну! Яна старэнькая, слабая, адзінокая, з выплаканымі вачыма. Слёзы яе ціхія, незаўважальныя. Душа ад болю і думак журботная.

А ён здаровы, дужы, багаты. “Апанеў! І далікатным зрабіўся, і гаворыць па-панску!” Лаўрук атрымаў адукацыю, стаў адвакатам, у горадзе жыве і забыўся на маці. Маці стала для яго чужаніцай. Вось толькі ці зможа адвакат з такой чорнай душой абараняць людзей, іх правы, біцца за іх? Мабыць, не. Я б да такога адваката за дапамогай не звярнулася.

Калі ён выгнаў маці з хаты, абазваўшы жабрачкай, мне аж дух заняло. Хіба так можна?! А гэтыя трохрублёвыя паперкі?! Ён адкупіўся ад маці. Вось цана матчынай пяшчоце і клопату. Іуда прадаў Хрыста за трыццаць сярэбранікаў, а Лаўрук прадаў сваё сумленне і матчыну любоў за некалькі трохрублёвак…

Лепш бы я гэтага не чытала. Але не. Трэба чытаць. Трэба чытаць і перачытваць. Такія творы вярэдзяць душу і прымушаюць думаць, разважаць…

Я ведаю, што нельга папрасіць прабачэння за другога чалавека. Але я не магу іначай.

Спадарыня Тэкля і ўсе матулі на зямлі, прабачце нам, сваім дзецям, усе крыўды. Як часта мы, неразумныя, крыўдзім вас, сваім маўчаннем, сваёй абыякавасцю, сваім забыццём, сваім свавольствам. Мы забываем, а часта проста не разумеем, колькі намаганняў вы прыкладаеце, каб выгадаваць нас, колькі начэй сядзіце побач, калі мы хварэем, аддаеце нам лепшае і смачнейшае, даруеце нам нашы памылкі, песціце і проста любіце.

Мая мілая, любая мамачка! Я абяцаю табе, што Ніколі, Ніколі, Ніколі цябе не пакрыўджу і не адцураюся ад цябе. Ты – мой падмурак, мая сіла, мая ясачка.

Калі была б магчымасць, я крыкнула б на ўвесь белы свет: людзі, не прымушайце сваіх матуль плакаць, не прыносьце ім сардэчны боль! Любіце сваю маму! Цаніце сваю маму!

Змітрок Бядуля расказаў гэту гісторыю не да канца. Напэўна, наўмысна. Аўтар даў магчымасць кожнаму чытачу прыдумаць свой канец.

Мне бачыцца працяг гэтай гісторыі такім.

Сонечнай зімовай раніцай каля акна стаяў статны немалады ўжо мужчына ў доўгім дамашнім халаце і некуды пазіраў. На першы погляд здавалася, што ён разглядае ледзяныя малюнкі, якімі так шчодра аздобіў шкло мароз. Але не. Ён глядзеў некуды далёка-далёка. Уся яго постаць, сціснутыя вусны гаварылі пра нейкае напружанне ўнутры, а яго вільготныя вочы – пра ўзрушаную душу. Прастаяўшы так даволі доўга, мужчына ўздрыгануўся, быццам нехта яго штурхануў, рашучай хадой падышоў да століка і пазваніў у невялічкі, але такі гучны званочак. Нячутна з’явіўся лёкай.

– Мне патрэбны самы найлепшы букет руж. Праз гадзіну выязджаю, – сказаў ён ціхім, але цвёрдым голасам і рашуча выйшаў з пакоя.

І праўда, праз гадзіну з дзвярэй двухпавярховага дома з калонамі выйшаў высокі мужчына ў доўгім чорным паліто і чорнай шляпе з вялізным букетам алых руж, загорнутых у паперу. Хуткай хадой ён накіраваўся да вазка. Пад яго бліскучымі лакавымі туфлямі храбсцеў снег. Ён лёгка ўскочыў у вазок, і конь крануўся з месца. Дворнік, які яшчэ з раніцы разграбаў каля дома сцежкі ад снегу, падумаў, што пан адвакат, Лаўрэнцій Кіпрыянавіч, пэўна, паехаў да нейкай пані з віншаваннямі. Але ён памыляўся. Пан адвакат паехаў туды, дзе не быў яшчэ ні разу.

Вазок лёгка бег па заснежанай дарозе. Лаўрэнцій Кіпрыянавіч заплюшчыў вочы і зноў пагрузіўся ў свае думкі. Напэўна, ён яшчэ доўга не адважыўся б на гэтую дарогу, каб не сон, які некалькі дзён не дае яму спакою, які разбудзіў яго душу і не выходзіць з галавы. Такіх сноў яшчэ не было ў яго. Тая ноч змяніла ўсё.

Яму снілася, што стаіць ён на нейкай паляне. Высокія дрэвы вакол. Птушкі спяваюць. Неба такое блакітнае, якое толькі ў снах і бывае. І раптам пачуўся вясёлы смех. З лесу на паляну выйшла жанчына з хлопчыкам. У кожнага кошыкі, поўныя грыбоў. Яны прыселі на траву. Маці абняла свайго сыночка, прытуліла да сябе, пацалавала. А хлопчык нешта весела ёй шчабятаў. Яны былі такія шчаслівыя, радасныя!

Прыгледзеўшыся, Лаўрэнцій зразумеў, што жанчына гэта – яго маці, толькі вельмі маладая, а хлопчык – ён сам. І раптам хлопчык працягнуў Лаўрэнцію жменю спелых суніц. Нейкае дагэтуль незнаёмае пачуццё агарнула яго ўсяго, стала так цёпла ўнутры, так пяшчотна. Яму захацелася прытуліцца да жанчыны, і толькі ён памкнуўся да яе, як нейкая птушка падляцела да яго і ў самае вуха ціўкнула: “Грэшнік”. Ад гэтага ён і прачнуўся. Доўга ляжаў. Заснуць больш не мог. Думкі плылі адна за другой, быццам хвалі на бераг. І вось гэтыя хвалі гоняць яго цяпер па снежнай дарозе.

Праз якія гадзіны дзве Лаўрэнцій Кіпрыянавіч прыехаў на месца. На месца вечнага спачыну сваіх бацькоў. Больш за дваццаць гадоў ён не быў у роднай вёсцы, з якой паехаў дзесяцігадовым хлопчыкам, і ніколі не быў на магілах бацькоў, нават і думаць не думаў пра іх.

Ён сышоў з вазка і разгублена стаяў, не ведаючы куды пайсці. Роспач ахапіла яго, з вачэй пакаціліся слёзы і ён прашаптаў упершыню за многія гады:

– Мама!

Раптам Лаўрэнцій пачуў “цвірк-цвірк-цвірк”. Ён павярнуўся на гэта цвірканне – маленькая птушачка, падобная на тую, што была ў яго сне, сядзела на старым перакошаным замшэлым крыжы.

– Цвірк-цвірк-цвірк, – зноў пачулася з крыжа.

Думка, што птушка ўказвае яму на магілы бацькоў, сцяла ўсяго. Яго калаціла не то ад холаду, не то ад страху. Немагчыма паверыць, што ўсё гэта не сон. Птушка цвіркнула і ў трэці раз. У Лаўрэнція ад напружання загуло ў галаве і ён выразна пачуў матчын голас:

– Лаўручок мой! Сынок!

На слабых нагах ён падышоў да двух невысокіх купінак з замшэлымі крыжамі. Колькі стаяў перад імі, не памятае. Але раптам зразумеў, што ўсё лепшае, што было ў яго жыцці: маці, дзяцінства, іх старая хата, нават апошняя сухая скарынка хлеба, духмяныя суніцы ўлетку і шмат што іншае, навекі страчанае – у гэтых двух купінках, і што для яго няма на свеце нічога даражэйшага за гэтыя купінкі…